## КЛЮЧАВЫЯ КАНЦЭПТЫ Ў АФАРЫСТЫЦЫ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

*К.С. Півавар*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Пад афарызмам мы разумеем выказванне, якое перадае лагічна закончаную думку (суджэнне) – жыццёвае назіранне, заклік, маральную сентэнцыю, параду, разважанне і г.д., выражаную абавязкова ў яскравай, трапнай і лаканічнай слоўнай форме. Найчасцей афарызмы ўваходзяць у склад мастацкіх, публіцыстычных, філасофскіх твораў. Вывучэнне афарызмаў актуальнае для спасціжэння сэнсавай арганізацыі тэкстаў, рэканструкцыі моўнай карціна свету народа.

Мэта артыкула – на аснове беларускіх мастацкіх афарызмаў вызначыць сэнсавае напаўненне ключавых сацыяльных канцэптаў *Радзіма*, *народ*, *мова*, *воля* метадамі суцэльнай выбаркі, апісальным, метадам кампанентнага аналізу.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для нашага даследавання паслужылі хрэстаматыйныя тэксты беларускай літаратуры. У дадзенай працы выкарыстаны элементы канкрэтна-гістарычнага, структурна-тыпалагічнага і дэскрыптыўнага аналізу.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Пад канцэптам большасць даследчыкаў разумее лінгваментальнае ўтварэнне, вербалізаваны культурны сэнс, які мае імя/імёны ў мове і ўключае ў сябе значэнне, культурныя канатацыі, паняцце і вобраз, што ляжыць у аснове наймення. Устаноўлена, што ключавымі канцэптамі становяцца толькі тыя з’явы рэчаіснасці, якія актуальныя і каштоўныя для дадзенай этнакультуры, маюць вялікую колькасць моўных адзінак для сваёй фіксацыі, рэпрэзентуюцца ў тэме парэмій, мастацкіх тэкстаў, неаднаразова рэалізуюцца ў іншых відах мастацтва. У беларускай літаратуры такімі ключавымі сацыяльнымі канцэптамі з’яўляюцца *Радзіма*, *народ*, *мова*, *воля*.

Канцэпт – аксіялагічнае і культурна-спецыфічнае па сваёй прыродзе ўтварэнне. Культурная і ментальная спецыфічнасць канцэпту *Радзіма* выяўляецца ў тым, што пісьменнікі адмаўляюць для беларусаў бязладную міграцыю, для беларусаў не характэрна бясконцае блуканне; стабільны, сталы, ураўнаважаны элемент пераважае ў складзе нацыянальнай псіхікі і мыслення: *Лепш грызці зямлю ў родным кутку, чым каб цябе ліхім ветрам кідала па чужым свеце* (К. Чорны. Пошукі будучыні); *Продкі ані мае, ні твае / Сваёй зямлі не мянялі* (Р. Барадулін. Самота паломніцтва); *От навука для тваіх дзяцей. Моцна ж накажы ты ім, дружа, каб не лёталі дарэмна па свеце, не бадзяліся: у сваім родным кутку работы досыць для кожнага* (Я. Колас. Хмаркі). Як адзначае В.А. Маслава, “беларусы – менш схільныя да перамяшчэнняў, гэта дастаткова аседлая нацыя, сярод іх нават зараз амаль няма эмігрантаў. А вымушаная эміграцыя цяжка перажываецца імі” [3, 66].

І разам з тым *чужына* (гэтае паняцце вербалізуецца праз моўныя адзінкі *чужына*, *чужая прастора*, *чужы свет*) як супрацьлеглае паняцце *Радзімы* часта паказваецца з негатыўнай канатацыяй у афарызмах беларускіх пісьменнікаў: *Далёкая старонка без ветру сушыць* (В. Казько. Неруш); *На чужой зямлі без каранёў і палын не расце* (В. Казько. Неруш); *Я не ганю землі чужыя – / Хай іх сонца не абміне. / Толькі дзе б за морам ні жыў я, / Беларусь мая снілася мне* (Г. Бураўкін. Я не ганю землі чужыя); *Хто ж з краёў далёкіх не сумуе па сваіх ваколіцах? Там нашыя жаданні і думкі жывуць; туды хацеў бы ляцець я на крылах!* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня).

Канцэпты *Радзіма* і *народ* цесна ўзаемазвязаны: у беларускіх афарызмах закранаецца тэма захавання гісторыі роднай краіны для захавання нацыі. Асабліва актуалізуецца тэма самавызначэння ў кантэкстах мастацкіх твораў канца XX – пачатку XXI ст., калі ва ўмовах глабалізацыі, міграцыі і сцірання этнічных межаў беларусам важна захаваць сваю самабытнасць: *Народ сябе пазнаць павінен! / Народ – не зборышча, не гурт, / Ён мусіць мець – інакш загіне! – / Усведамлення цвёрды грунт. / Калі ён сам сябе ўсвядоміў, / Сваю гісторыю, свой лёс, / Свае правы ва ўласным доме, – / Тады – народ, тады – ён ёсць* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці); *Вазьмі ў звычай, сын герояў і багоў, / Не пагарджаць святым сваім мінулым, / А заслужыць яшчэ, і вартым быць яго* (У. Караткевіч. Беларускае мінулае).

Самая яскравая рыса беларусаў – мірны характар, добрыя адносіны да іншых народаў, што вербалізуецца ў мастацкай афарыстыцы: *Па агульным назіранні, беларусам прыродна ўласцівая павага да іншых народаў і памяркоўнасць да таго, хто думае іначай* (У. Караткевіч.

Репозиторий ВГУ

Зямля пад белымі крыламі); …); *Ёсць за што, ёсць за што / І народу майму ганарыцца: / Не хадзіў і не лез ён / На землі чужыя вайной* (Ю. Свірка. Верны крэўнаму брацтву). Гісторыя пацвярджае, што беларусы ніколі не вызначаліся грубай агрэсіўнасцю ў стасунках нават з тымі людзьмі, якія да іх адносіліся часам нядобразычліва. У характары беларусаў – схільнасць да бесканфліктнага вырашэння праблем.

Адзін з першых пісьмовых афарызмаў, у якім вербалізуецца канцэпт *мова*, – урывак са Статута Вялікага Княства Літоўскага, у якім ідзе гаворка пра старабеларускую мову як мову дзяржавы і закона: *Любому народу сорам не ведаць сваіх законаў, а нам жа асабліва, бо законы нашы выкладзены не на нейкай чужаземнай мове, а на сваёй роднай, і мы маем магчымасць звярнуцца да іх у любы час, даведацца, якім менавіта законам бараніцца супраць усялякай крыўды* (Зварот Льва Сапегі да ўсіх саслоўяў Вялікага Княства Літоўскага (з нагоды выдання Статута 1588 г.).

У афарыстычнай форме пісьменнікі нагадваюць пра немагчымасць існавання беларусаў як этнасу без роднай мовы на прыкладзе іншых народаў: *Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, так як той чалавек прад скананнем, катораму мову зойме, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!* (Ф. Багушэвіч. Прадмова да зборніка “Дудка беларуская”); *Мейце сілу і адвагу дзяржацца роднага слова. Мейце смеласць усюды голасна казаць па-свойму. І, гледзячы на вас, асмеляцца і іншыя* (Цётка. Шануйце роднае слова).

У афарызмах беларускіх пісьменнікаў мова выступае як найкаштоўнейшы нацыянальны здабытак: *Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор – мова* (А. Разанаў); *Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная* (Ф. Багушэвіч);

Як паказвае тэматыка беларускіх мастацкіх твораў, яшчэ адным каштоўным здабыткамі беларускага народа з’яўляецца *воля,* а таму лексічная апазіцыя свабоды – няволя – уяўляецца бядой, цяжкім выпрабаваннем: *Мудрацы розных часоў лічылі, што ў кожнай дзяржаве прыстойнаму чалавеку даражэй за ўсё на свеце яго свабода. Няволя ж настолькі агідная, што ад яе трэба пазбаўляцца ўсімі сродкамі. Таму людзі, якія паважаюць сябе, не павінны шкадаваць ні маёмасці, ні нават свайго жыцця, каб не трапіць пад жорсткую ўладу няволі. А тыя, хто зрабіўся паднявольным, але мае свабодалюбівы характар, таксама не павінны цярпець над сабой непрыяцеля. І не толькі нейкага чужаземца, да якога трапілі ў палон, але і свайго тутэйшага* (Леў Сапега. Прадмова да Статута 1588 г.); *Бог барані, калі нас перамогуць прышэльцы, / Лепш ужо смерць нам усім без пары, чым такая / Доля – жыццё пад’ярэмнае ў чорнай няволі* (М. Гусоўскі. Песня пра зубра); *Лепш змагацца вольным, браце, / Чым цярпець ды гнуцца!* (Я. Колас. Будзь цвёрды).

**Заключэнне.** Такім чынам, вылучаныя намі афарызмы з твораў мастацкіх твораў, яскрава сведчаць, што ключавыя сацыяльныя канцэпты *Радзіма, народ, мова, воля* валодаюць вялікай аксіялагічнай значнасцю ў беларускай нацыянальнай карціне свету: *Мой родны кут, як ты мне мілы!* (Я. Колас*), Свабода – найвышэйшая маральная каштоўнасць* (В. Быкаў) і г. д. Засваенне мастацкай літаратуры, яе багатай вобразнасцю і афарыстычнай мовы – сродак пранікнення ў культуру і ментальнасць беларускага народа.


1. Беларуская літаратурная спадчына : анталогія. У 2 кн. Кн. 1 / уклад. П.М. Лапо [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2011. – 944 с.
2. Беларуская літаратурная спадчына : анталогія. У 2 кн. Кн. 2 / уклад. С.А. Курбанава [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 1029 с.
3. Маслова, В.А. Национальный характер сквозь призму языка : монография / В.А. Маслова. – Витебск : УО «ВГУ им. П.М. Машерова», 2011. – 76 с.


## ТЭМАТЫЧНА-ВОБРАЗНЫ СВЕТ ПАЭЗІІ УЛАДЗІМІРА ПАПКОВІЧА


*І.В. Саматой*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Уладзімр Папковіч – беларускі паэт, перакладчык, актыўная і самабытная творчая дзейнасць якога прыпадае на 60-ыя гады XX – пачатак XXI стагоддзя і не губляецца ў багатай на таленты прасторы нацыянальнага прыгожага пісьменства. Створаная паэтам мастацкая мадэль свету нясе ў сабе адбітак асабіста перажытага, маральную далучанасць да жыцця народа, пава-



Рэпазіторый ВДУ